COMMITTEE OF MINISTERS
COMITÉ DES MINISTRES

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE

**MINISTERS' DEPUTIES**
**DÉLÉGUÉS DES MINISTRES**

Resolutions
Résolutions

**CM/Res(2020)2**

22/01/2020

---

# Resolution on the Council of Europe youth sector strategy 2030

*Unofficial translation into Belarusian*

# Résolution relative à la Stratégie du Conseil de l'Europe pour le secteur jeunesse à l'horizon 2030

*Traduction non-officielle en biélorusse*

# Рэзалюцыя CM/Res(2020)2 аб стратэгіі моладзевага сектара Савета Еўропы да 2030 года

---

*© Council of Europe, original English and French versions*

*Text originated by, and used with the permission of, the Council of Europe. This unofficial translation is published by arrangement with the Council of Europe, but under the sole responsibility of the translator.*

* * * * *

*© Conseil de l'Europe, versions originales en anglais et français*

*Le texte original provient du Conseil de l'Europe et est utilisé avec l'accord de celui-ci. Cette traduction est réalisée avec l'autorisation du Conseil de l'Europe mais sous l'unique responsabilité du traducteur.*

## Рэзалюцыя CM/Res(2020)2 аб стратэгіі моладзевага сектара Савета Еўропы да 2030 года

*(Прынятая Камітэтам міністраў 22 студзеня 2020 года на 1365-м пасяджэнні намеснікаў міністраў)*

Камітэт міністраў,

прымаючы пад увагу дэкларацыю і план дзеянняў, прынятыя на 3-м Саміце кіраўнікоў дзяржаваў і ўрадаў Савета Еўропы ў Варшаве ў траўні 2005 года, у якім, у прыватнасці, гаворыцца, што "Савет Еўропы будзе далей развіваць сваю унікальную пазіцыю ў моладзевай сферы";

прымаючы пад увагу дэкларацыю, прынятую Камітэтам міністраў на яго 129-й сесіі ў траўні 2019 года ў Хельсінкі з нагоды 70-годдзя Савета Еўропы, якая, у прыватнасці, гаворыць, што "еўрапейскае адзінства патрэбнае цяпер як ніколі раней для супрацьстаяння новым пагрозам, якія стаяць перад нашымі грамадствамі. Жыццёва важна, каб арганізацыя хутка і эфектыўна рэагавала на праблемы, што паўстаюць у дзяржавах-удзельніцах.(...) З гэтай мэтай мы абавязуемся ўмацоўваць унікальную ролю Савета Еўропы як эфектыўнай асновы для агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва”;

прымаючы пад увагу тую ж дэкларацыю, у якой аўтары таксама прызнаюць “ключавую ролю грамадзянскай супольнасці” і абавязваюцца “весці змястоўны і празрысты дыялог з грамадзянскай супольнасцю на ўсіх узроўнях нашага ўзаемадзеяння”;

з гэтага пункту погляду, падкрэсліваючы важнасць сістэмы сумеснага кіравання Савета Еўропы ў моладзевай сферы як жывога прыклада партысіпатыўнай дэмакратыі, якая аб’ядноўвае галасы маладых еўрапейцаў і прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, адказных за моладзевыя пытанні, у Аб’яднаным савеце па справах моладзі (CMJ);

прымаючы пад увагу Еўрапейскую культурную канвенцыю і Рамачную канвенцыю Савета Еўропы аб абароне нацыянальных меншасцяў;

прымаючы пад увагу Дэкларацыю 8-й Канферэнцыі міністраў па справах моладзі Савета Еўропы, пад назвай "Будучыня моладзевай палітыкі Савета Еўропы: Павестка на 2020 год", прынятую ў Кіеве ў кастрычніку 2008 года, і Рэзалюцыю CM/Res(2008)23 аб моладзевай палітыцы Савета Еўропы, прынятую Камітэтам міністраў 25 лістапада 2008 года;

прымаючы пад увагу дасягненні і ўрокі, вынесеныя з парадку дня на 2020 год;

нагадваючы пра патрэбу захоўваць і ўзмацняць асноўныя дасягненні Савета Еўропы ў галіне моладзевай палітыкі, уключна з Рэкамендацыяй CM/Rec(2019)4 Камітэта міністраў для дзяржаваў-удзельніц аб падтрымцы маладых уцекачоў пры іх уваходзе ў дарослае жыццё, Рэкамендацыяй CM/Rec(2017)4 Камітэта міністраў для дзяржаваў-удзельніц аб працы з моладдзю, Рэкамендацыяй CM/Rec(2016)7 Камітэта міністраў для дзяржаваў-удзельніц аб доступе маладых людзей да правоў, Рэкамендацыяй CM/Rec(2015)3 Камітэта міністраў для дзяржаваў-удзельніц аб доступе маладых людзей з небяспечных раёнаў да сацыяльных правоў, Рэкамендацыяй CM/Rec(2010)7 Камітэта міністраў для дзяржаваў-удзельніц па Хартыі Савета Еўропы па адукацыі для

дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека, Рэкамендацыяй Rec(2006)14 Камітэта міністраў для дзяржаваў-удзельніц аб грамадзянскасц і і ўдзеле маладых людзей ў грамадскім жыцці, Рэкамендацыяй Rec(2004)13 Камітэта міністраў для дзяржаваў-удзельніц аб удзеле моладзі ў мясцовым і рэгіянальным жыцці, Рэкамендацыяй Rec(2003)8 Камітэта міністраў для дзяржаваў-удзельніц аб прасоўванні і прызнанні пазафармальнай адукацыі/навучання моладзі, а таксама Дэкларацыяй Decl(29/05/2019) Камітэта міністраў аб выніках моладзевай кампаніі "Рух супраць нянавісці";

прымаючы пад увагу Стратэгію Савета Еўропы па правах дзіцяці (2016-2021), Стратэгію Савета Еўропы па гендарнай роўнасці (2018-2023), Стратэгію Савета Еўропы па інваліднасці (2017-2023), Тэматычны план дзеянняў па інтэграцыі цыганоў-рома і трэвэлераў (2016-2019), Рэкамендацыю 1805 (2007) Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы аб блюзнерстве, рэлігійных абразах і распальванні рэлігійнай варожасці да асобаў, а таксама працу Савета Еўропы ў галіне кіравання інтэрнэтам і штучнага інтэлекту;

прымаючы пад увагу Рэзалюцыю Савета Еўрапейскага Саюза і прадстаўнікоў урадаў дзяржаваў-удзельніц, якія бяруць удзел у паседжаннях Савета, аб "рамках еўрапейскага супрацоўніцтва ў моладзевай сферы": Моладзевая стратэгія Еўрапейскага Саюзу на 2019-2027 гады", у якой, у прыватнасці, гаворыцца, што "трэба заахвочваць далейшае ўзаемадзеянне з працай, якую праводзіць Савет Еўропы ў гэтай галіне";

прымаючы пад увагу рэзалюцыю ААН A/RES/70/1, прынятую Генеральнай Асамблеяй 25 верасня 2015 года "Пераўтварэнне нашага свету: Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года" і моладзевую стратэгію ААН "Моладзь 2030: праца з моладдзю і ў інтарэсах моладзі";

прызнаючы важнасць забеспячэння узгаднення і ўзаемадзеяння з працай усіх адпаведных міжнародных арганізацыяў, якія займаюцца моладзевымі пытаннямі, у прыватнасці, з Еўрапейскім Саюзам і Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый;

нагадваючы, что ўстойлівасць любога дэмакратычнага грамадства залежыць ад творчага падыхода, дынамізма, сацыяльнай адказнасці і кампетэнтнасці ягонай моладзі;

пацвярджаючы унікальны геаграфічны абсяг і ролю моладзевага сектара Савета Еўропы і ягоных інструментаў, у тым ліку сістэмы супольнага кіравання, Еўрапейскіх моладзевых цэнтраў у Страсбургу і Будапешце, Еўрапейскага моладзевага фонду і партнёрства з Еўрапейскай камісіяй па пытаннях моладзі, у прыцягненні маладых людзей да ўдзелу ў дзейнасці ў Еўропе і ў рэалізацыі каштоўнасцяў дэмакратыі і правоў чалавека;

зважаючы на неабходнасць таго, каб Савет Еўропы мэтанакіравана і паслядоўна інвеставаў ў моладзь, абапіраючыся на падыход,  арыентаваны на стварэнне магчымасцяў, у прыватнасці праз дапамогу дзяржавам-удзельніцам у развіцці моладзевай палітыкі адпаведна з стандартамі Савета Еўропы;

зважаючы на хранічныя праблемы, з якімі сутыкаюцца маладыя людзі, як з пункту погляду адсутнасці прапанаваных ім магчымасцяў, так і з пункту погляду павышанай рызыкі сацыяльнай няўстойлівасці, але, тым не менш, будучы перакананы ў іх значным

патэнцыяле і, адпаведна, у іх фундаментальнай ролі ў прасоўванні асноўных каштоўнасцяў Савета Еўропы;

падкрэсліваючы канкрэтны ўнёсак моладзевага сектару Савета Еўропы ад 1972 года ў дасягненне мэтаў арганізацыі і ейную здольнасць выпрацоўваць адпаведныя захады ў адказ на новыя сітуацыі і праблемы, напрыклад, у галіне змены клімату, штучнага інтэлекту і кіравання інтэрнэтам;

падкрэсліваючы важнасць усталявання ў гэтым кантэксце новых стратэгічных рамак на 2020-2030 гады;

прымаючы да ведама даведкавы дакумент па стратэгіі моладзевага сектара Савета Еўропы да 2030 года, прыняты Сумесным Саветам па справах моладзі ў кастрычніку 2019;

1. пастанаўляе, што моладзевы сектар Савета Еўропы павінен быць скіраваны на тое, каб даць маладым людзям ва ўсёй Еўропе магчымасці актыўна падтрымліваць, абараняць, прасоўваць і карыстацца асноўнымі каштоўнасцямі Савета Еўропы – правамі чалавека, дэмакратыі і вяршынства закону, у прыватнасці, шляхам:

- пашырэння доступу маладых людзей да правоў, каб яны і усе формы моладзевай грамадзянскай супольнасці маглі абапірацца на спрыяльныя ўмовы для поўнага ажыццяўлення ўсіх сваіх правоў і свабодаў, уключна з канкрэтнымі стратэгіямі, механізмамі і рэсурсамі;

- паглыблення ведаў моладзі з тым, каб дэмакратычны ўдзел маладых людзей падтрымліваўся дзейнымі супольнасцямі, якія прадукуюць веды і досвед;

- пашырэння істотнага ўдзелу моладзі ў прыняцці рашэнняў на падставе шырокага сацыяльнага і палітычнага кансэнсусу ў падтрымку інклюзіўнага, партысіпатыўнага кіравання і падсправаздачнасці;

2. пастанаўляе, што наступныя пытанні павінны разглядацца як тэматычныя прыярытэты стратэгіі моладзевага сектара Савета Еўропы на перыяд да 2030 года і павінны ляжаць у аснове яго працы да 2030 года:

a. адраджэнне плюралістычнай дэмакратыі з асаблівай увагай да:

- пашырэння магчымасцяў моладзевай грамадзянскай супольнасці ў справе развіцця партысіпатыўнай дэмакратыі і дэмакратычнага грамадзянства ў межах і па-за межамі складу ўдзельнікаў;

- правядзення большай колькасці працэсаў па распрацоўцы палітыкі і кіраванні шляхам змястоўнага і шырокага ўдзелу, прыцягваючы розныя групы моладзі і іх прадстаўнікоў/арганізацыі;

- умацавання моладзевай палітыкі і моладзевай працы у зняцці перашкодаў да ўдзелу моладзі ў грамадскім і палітычным жыцці;

- паляпшэння шляхоў інстытуцыйнага рэагавання на новыя тэндэнцыі ў галіне дэмакратыі, такія як змены ў мадэлях моладзевага прадстаўніцтва, дыгітызацыя і кіраванне інтэрнэтам;

b. доступ моладзі да правоў з асаблівай увагай да:

- спрыяння прагрэсу ў рэалізацыі стандартаў Савета Еўропы, якія тычацца доступу моладзі да правоў;
- нарошчвання патэнцыялу і рэсурсаў моладзевых арганізацый і іншых зацікаўленых бакоў для забеспячэння адукацыі ў галіне правоў чалавека і доступа да правоў;
- паляпшэння інстытуцыйных мер рэагавання на ўзнікненне новых праблем, якія закранаюць правы маладых людзей і іх уваход у дарослае жыццё, такія як наступствы змены клімату і пагаршэння стану навакольнага асяроддзя, штучны інтэлект, лічбавая прастора, рост мабільнасці, новыя формы занятасці і іншыя;

c. супольнае жыццё ў мірных і адкрытых грамадствах, з асаблівай увагай да:

- надзялення зацікаўленых бакоў больш шырокімі магчымасцямі для вырашэння праблемаў пабудовы адкрытых грамадстваў як пры дапамозе стратэгіяў, праграмаў і праектаў, якія ўключаюць разнастайнасць, так і пры дапамозе эфектыўнага маніторынга і процідзеяння дыскрымінацыі, гвалту і ізаляцыі;
- забеспячэння доступу маладых людзей, у тым ліку тых, хто пераЖывае любую форму дыскрымінацыі і ізаляцыі, да тых магчымасцяў, якія паглыбляюць іх імкненне да дэмакратычнага грамадзянства і пашыраюць здзяйсненне ягоных прынцыпаў;
- больш выразнага замацавання ключавых асноваў, такіх як еўрапейскае адзінства, глабальная салідарнасць, мір, разнастайнасць, міжкультурны дыялог, дыялог паміж пакаленнямі і экалагічная устойлівасць, у стратэгіі, практыцы і даследаваннях у моладзевым сектары і па-за ім;
- умацавання патэнцыялу моладзі, ейнай здольнасці да дзеяння і лідэрства ў мэтах перадухілення гвалту, урэгулявання канфліктаў і стварэння культуры міра шляхам істотнай падтрымкі фінансавання, стварэння арганізацыйных сетак і прызнання ўсёй разнастайнасці моладзі і шляхоў ейнай самаарганізацыі;

d. праца з моладдзю з асаблівай увагай да:

- умацавання, прызнання і прасоўвання стратэгіі і практыкі моладзевай працы праз уключэнне моладзевай працы ў структуры моладзевай палітыкі, у прыватнасці праз еўрапейскі парадак дня па працы з моладдзю і ягоную рэалізацыю ў шчыльным супрацоўніцтве з Еўрапейскім Саюзам;
- паляпшэння якасці працы з моладдзю, якую выконваюць як валанцёры, так і моладзевыя работнікі на платных пасадах;
- пашырэнню доступа і прывабнасці працы з моладдзю і нефармальнай адукацыі/навучання на карысць больш шырокіх масаў маладых людзей;

3. пастанаўляе, што вышэйназваныя прыярытэты павінны быць падмацаваныя наступнымі прынцыпамі, якімі Савет Еўропы кіруецца ў сваіх дачыненнях з моладдзю: узаемная павага і давер, інклюзіўнасць, трывалыя абавязацельствы, удзел, роўнасць, празрыстасць і супрацоўніцтва;

4. пастанаўляе, што названыя вышэй прыярытэты павінны быць рэалізаваныя шляхам:

- міжурадавага супрацоўніцтва на агульнаеўрапейскім узроўні па падрыхтоўцы і здзяйсненні моладзевай палітыкі, заснаванай на стандартах Савета Еўропы;
- дапамогі ў развіцці моладзевай палітыкі ў краінах-удзельніцах шляхам двухбаковых і шматбаковых мераў падтрымкі;
- павелічэння патэнцыялу маладых інструктараў (моладзевых лідэраў і тых, хто працуе з моладдзю), у прыватнасці праз Еўрапейскія моладзевыя цэнтры і іх праграмы адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі;
- эфектыўнага кіравання і ўдзелу моладзі, у прыватнасці праз сістэму сумеснага кіравання, збіраючы разам маладых людзей і прадстаўнікоў урадаў для прыняцця рашэнняў, якія павінны стаць галоўнай платформай для развіцця агульнаеўрапейскага кансэнсусу, легітымнасці і шматбаковай адказнасці ў моладзевай сферы, а таксама прасторай для палітычнага і міжінстытуцыйнага супрацоўніцтва;
- фінансавай падтрымкі развіцця моладзевай грамадзянскай супольнасці, у прыватнасці праз Еўрапейскі моладзевы фонд;
- інавацыяў у працы з моладдзю, моладзевай палітыцы і даследаваннях па пытаннях моладзі;
- супрацоўніцтва паміж дырэктыўнымі органамі, работнікамі і даследчыкамі ў моладзевай сферы;
- павышэння якасці працы і ўсталявання стандартаў у галіне моладзевай палітыкі;
- супрацоўніцтва з Еўрапейскім Саюзам і партнёрскіх сувязяў з іншымі зацікаўленымі бакамі і службамі, якія задзейнічаныя ў сферах, датычных працы моладзевага сектару Савета Еўропы;
- улічвання інтарэсаў моладзі і міжведамаснага супрацоўніцтва ў межах Савета Еўропы;
- актыўным інфармаваннем і прыцягненнем маладых людзей, якія знаходзяцца ў неспрыяльным становішчы;
- прагназавання будучых тэндэнцый, праблемаў і магчымасцяў;

5. пастанаўляе, што дадзеная стратэгія павінна здзяйсняцца з дапамогай наступных узаемазвязаных і ўзаемазалежных інструментаў моладзевага сектару Савета Еўропы:

- адпаведных сумесна кіраваных установаў моладзевага сектару Савета Еўропы, якія павінны распрацоўваць праграмы дзейнасці, заснаваныя на дадзенай рэзалюцыі, і ў адпаведных выпадках прадстаўляюць прапановы па стандартах у Камітэт міністраў;
- Еўрапейскіх моладзевых цэнтраў і Еўрапейскага моладзевага фонду, якія павінны і надалей падтрымлівацца у выкананні іхняй ролі па развіцці і пашырэнні еўрапейскага моладзевага супрацоўніцтва, заснаванага на асноўных каштоўнасцях Савета Еэропы;
- партнёрства з Еўрапейскай камісіяй па справах моладзі, якую належыць і надалей падтрымліваць як прыклад добрага супрацоўніцтва паміж двума партнёрамі;

6. пастанаўляе, што дадзеная стратэгія павінна здзяйсняцца і перыядычна ацэньвацца праз паслядоўныя праграмы і бюджэты Савета Еўропы да 2030 году, і што Сумесны савет па справах моладзі (CMJ) мусіць адпаведным чынам падводзіць вынікі ейнага ажыццяўлення.